ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Стварыць стварылі, а ўкараняць?

**Спікер верхняй палаты ўзяў удзел у нарадзе па развіцці навукі**

**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, узяў удзел у нарадзе аб праблемах і перспектывах развіцця беларускай навукі, што праводзіў на мінулым тыдні кіраўнік дзяржавы.**

Цяпер у нашай краіне шукаюць аптымальны варыянт дзяржзакупак навукова-даследчых распрацовак, заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй Кабякоў падчас мерапрыемства. У Беларусі рыхтуецца праект адпаведнага нарматыўнага прававога акта. Ён будзе датычыцца прадукцыі, атрыманай у выніку навукова-даследчых і доследна-канструктарскіх работ, інвестыцыйных праектаў. Менавіта праблему з яе ўкараненнем у вытворчасць закрануў на нарадзе старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч.

## Сябруем парламентамі

**У верхняй палаце абмеркавалі супрацоўніцтва з Дзяржавай Ізраіль**

**У Савеце Рэспублікі адбылася сустрэча спікера верхняй палаты беларускага парламента Міхаіла Мясніковіча з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Дзяржавы Ізраіль у нашай краіне Алонам Шогамам.**

Бакі абмеркавалі развіццё беларуска-ізраільскага міжпарламенцкага ўзаемадзеяння, шырокі спектр пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай і іншых сферах, якія ўяўляюць узаемную цікавасць. Па выніках гутаркі выказана ўзаемная зацікаўленасць у далейшым пашырэнні ўзаемавыгадных сувязяў, у тым ліку па лініі парламентаў дзвюх краін. У сустрэчы таксама прыняў удзел старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, кіраўнік рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентам Дзяржавы Ізраіль Аляксандр Папкоў.

## Таксі, прадпрымальніцтва і ЕАЭС

**Праблемныя пытанні дарожнай сферы абмеркавалі ў Савеце Рэспублікі**

**Пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра Папкова прайшла нарада па абмеркаванні законапраекта «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб аўтамабільным транспарце і аўтамабільных перавозках», які плануецца разгледзець у ходзе другой сесіі Савета Рэспублікі шостага склікання.**

Удзельнікі нарады абмеркавалі палажэнні законапраекта, якія датычацца павышэння эфектыўнасці функцыянавання рынку перавозак пасажыраў аўтамабілямі-таксі, стварэння ўмоў для развіцця прадпрымальніцкай ініцыятывы і дзяржаўна-прыватнага партнёрства, а таксама для далейшай інтэграцыі аўтатранспартнай сістэмы Рэспублікі Беларусь у аўтатранспартныя сістэмы Еўразійскага эканамічнага саюза і Еўрапейскага саюза. Акрамя таго, выпрацаваны канкрэтныя меры па вырашэнні праблемных пытанняў пры ажыццяўленні міжнародных аўтамабільных перавозак.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

ДАПАМОГА

# Калі кожнае дрэва — на вагу золата

### Савет Рэспублікі працуе не толькі «ў кабінетах», але і на зямлі

**У апошні дзень добраахвотнай акцыі «Тыдзень лесу — 2017» кіраўніцтва Савета Рэспублікі і работнікі Сакратарыята адправіліся ў Мінскую вобласць — у Бараўлянскі спецлягас. Каля 40 чалавек на працягу некалькіх гадзін высаджвалі дрэвы, каб аднавіць пацярпелую тэрыторыю.**

Участак непадалёк ад вёскі Прылессе быў пашкоджаны ўраганам 13 ліпеня 2016 года. Тут была праведзена высечка, а атрыманую пасля яе драўніну рэалізавалі на ўнутраным рынку. «Каб зямля не пуставала, мы аднаўляем лясныя культуры, — адзначае **дырэктар Бараўлянскага спецлягаса Аляксандр МІРАНОВІЧ**. — Пасадачны матэрыял — гэта двухгадовая хвоя з палепшанымі генетычнымі якасцямі». Сіламі ўдзельнікаў акцыі была адноўлена тэрыторыя ў памеры 3,6 гектара, пры гэтым на кожным з іх пасаджана больш за 5 тысяч маладых дрэў.

«Дапамога людзей — каласальны ўклад у нашу працу, паколькі самастойна лясгасам вельмі складана аднавіць такія плошчы», — падкрэслівае Аляксандр Міранові́ч. Па словах дырэктара спецлясгаса, акрамя арганізацый, дапамогу прапаноўваюць і звычайныя людзі. «Сямейныя пары з дзецьмі прыязджалі, каб паўдзельнічаць. Ды і цяпер на многіх участках прысутнічаюць добраахвотнікі, мясцовыя жыхары, якія проста хочуць дапамагчы».

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір ПАНЦЮХОЎ** ужо пяты год запар выязджае на пасадку дрэў. «Я і іншыя ўдзельнікі прыехалі, каб зрабіць свой маленькі ўнёсак у такую вялікую справу. Бо лес — гэта наша здароўе. У многіх краінах, напрыклад у Фінляндыі і Японіі, лесам лечаць: раяць у ім прагульвацца, дыхаць свежым паветрам, — заўважыў Уладзімір Панцюхоў. — Цяжка сказаць, колькі я пасадзіў дрэў за гэтыя гады. Безумоўна, набярэцца некалькі сотняў».



— Мы ўжо традыцыйна выязджаем і ўдзельнічаем у гэтай акцыі, — адзначыў **начальнік Сакратарыята Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Аляксандр СЛАБАДЧУК**. — З'яўляецца магчымасць адчуць свой уклад у агульную справу — захаванне прыроды. Бо для нас кожнае дрэва — на вагу золата. Кожны будзе памятаць, што на гэтым кавалачку зямлі, на гэтым месцы ён пасадзіў дрэва. І гэта гісторыя, якую можна перадаць дзецям, унукам і якой сапраўды можна ганарыцца.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

МЕРКАВАННЕ

# У ДАПАМОГУ ІНТЭГРАЦЫЙНЫМ ПРАЦЭСАМ

### Што могуць зрабіць заканатворцы?

**У адзіночку ў сучасным глабалізаваным свеце не выстаіш. Таму, каб больш паспяхова развівацца, краіны мусяць інтэгравацца з іншымі, суадносячы ўласныя эканамічныя, заканадаўчыя працэсы з краінамі-партнёрамі. Для Беларусі, сярод іншых аб'яднанняў, ключавымі выступаюць Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі, а таксама Еўразійскі эканамічны саюз. Але і тут не абыходзіцца без хібаў рознага плану, у тым ліку заканадаўчых. Якім чынам іх варта ліквідаваць?**

**Ала БОДАК, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве:**

— Падчас адкрыцця другой сесіі Савета Рэспублікі, акрамя асноўных задач, якія і без таго закладзены ў плане работы камісіі, Міхаіл Мясніковіч агучыў тыя, на якія варта скіраваць увагу. Адна з іх — уніфікацыя і гарманізацыя ў межах Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі і Еўразійскага эканамічнага саюза.

Задача ўсіх структур Саюзнай дзяржавы і асабліва яе Парламенцкага сходу — гэта збліжэнне нацыянальных заканадаўстваў у мэтах стварэння роўных умоў для суб'ектаў гаспадарання і ўраўнаважанне правоў грамадзян Беларусі і Расіі. Сэнс уніфікацыі і гарманізацыі заключаецца ў тым, каб нацыянальныя заканадаўствы мелі максімальна падобныя падыходы да прававога рэгулявання. У нашых суб'ектаў гаспадарання яшчэ з савецкіх часоў засталіся эканамічныя, асабістыя сувязі. Для таго каб ім было прасцей працаваць на сумесным рынку, трэба пастаянна збліжаць заканадаўчую базу. Гэта датычыцца і прызнання адукацыйных дакументаў, у тым ліку ў сферы вышэйшай адукацыі і навуковай сферы, і рэалізацыі права на ахову здароўя. Я з'яўляюся намеснікам старшыні Камісіі па заканадаўстве і рэгламенце Саюза Беларусі і Расіі, і для нас важна выпрацаваць такі механізм, які б стаў універсальным для любой сферы і эфектыўна працаваў.

Што датычыцца Еўразійскага эканамічнага саюза, то тут гаворка ідзе ўжо пра пяць удзельнікаў аб'яднання. У ім няма парламенцкага вымярэння, але ёсць хібы ў заканадаўстве, якія яшчэ належыць выправіць. Сумесна з Саветам Міністраў, які адказвае за дадзены кірунак, мы будзем садзейнічаць гэтай рабоце.

Трэба зазначыць, што такая праца праводзіцца не з чыстага ліста, а вядзецца нашай камісіяй даўно.

Таксама адным з важных для нас кірункаў з'яўляецца садзейнічанне стварэнню больш камфортных умоў для вядзення бізнесу. Адзін з членаў Савета Рэспублікі бярэ ўдзел у рабочай групе па пытаннях удасканалення кантрольнай дзейнасці і выключэння залішніх патрабаванняў да бізнесу, якая створана распараджэннем Прэзідэнта. З нашым удзелам ён прадставіў пісьмовыя прапановы, якія ўжо былі ўнесены ў частцы ўдасканалення інвестыцыйнай дзейнасці, занятасці насельніцтва, аптымізацыі юрыдычнай адказнасці ў сферы бізнесу. Гэта аптымізацыя мер адказнасці за шэраг эканамічных злачынстваў, увядзенне адміністрацыйнай прэюдыцыі ў дачыненні да тых учынкаў, якія сёння з'яўляюцца эканамічнымі злачынствамі, пераход іх у разрад адміністрацыйных правапарушэнняў. Мы прапануем прыдаць новы характар норме Крымінальнага кодэкса, якая кажа пра тое, што эканамічна абгрунтаваная рызыка з'яўляецца падставай для вызвалення ад крымінальнай адказнасці. Норма павінна рэальна працаваць. Меры юрыдычнай, крымінальнай, адміністрацыйнай адказнасці варта паляпшаць нараўне з мерамі па лібералізацыі парадку вядзення бізнесу. Гэта трэба рабіць адначасова.

**Рыгор БЫСЮК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы:**

— Задачай камісіі з'яўляецца далейшае развіццё міжнароднага супрацоўніцтва, у тым ліку з краінамі дальняй дугі, такімі як, напрыклад, Кітай, Іран і іншыя. На нядаўнім пасяджэнні камісіі мы абмяркоўвалі перспектыву бязвізавага рэжыму з Аргенцінай. У нас ужо створана дэпутацкая група па падрыхтоўцы гэтага пытання, чакаецца, што аргенцінскія калегі ў хуткім часе таксама сфарміруюць групу з членаў парламента і пачнецца прадметны абмен інфармацыяй. Таксама на парадку дня застаецца выпрацоўка дакументаў па ўдакладненні дзейнасці Еўразійскага эканамічнага саюза.

**Алег РУМО, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы:**

— Мы вельмі спадзяёмся, што Еўразійскі эканамічны саюз нарэшце пачне прыносіць карысць нашай краіне, што ўсе дамоўленасці, якія былі дасягнуты, будуць рэалізаваны. Мы пазбавімся ад абмежаванняў і будзем сапраўды на роўных гандляваць з нашымі партнёрамі. Акрамя таго, мы спадзяёмся, што кантакты ў гуманітарнай сферы яшчэ больш умацуюцца і разаўюцца, таму што гэта таксама вельмі важны складальнік любога міжнароднага супрацоўніцтва. Я маю на ўвазе ўсё: адкультуры, навукі, аховы здароўя, адукацыі і да асабістых, чыста чалавечых кантактаў. Менавіта таму дапрацоўкі патрабуе заканадаўчая база ЕАЭС, над чым мы і будзем працаваць.

**Ніна ЖАЛЯЗНОВА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:**

— У членаў камісіі ёсць свае вытворчыя аб'екты і сферы дзейнасці, і кожны будзе працаваць у сваёй сферы ў рамках інвестыцый. Я, як кіраўнік сельскагаспадарчага прадпрыемства, вывучаю гэта пытанне ў сваім кірунку. Трэба думаць, якія павінны прыйсці інвестыцыі, каб правільна выкарыстоўваць пэўны рэсурс. Да патэнцыйнага інвестара трэба ставіцца вельмі ўважліва: адна справа, калі ён проста набывае абсталяванне, але іншая — калі навязвае сваю тэхналогію. Ці заўсёды яна адпавядае таму, што хочам мы для сваёй зямлі? Таму мы вельмі ўважліва прапрацуем менавіта аспект інвестыцый.